## *§ 29–0. Савецкае дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917–1939 гг.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА
«ЧЫРВОНЫЯ» «БЕЛЫЯ» АЎТАНОМІЯ
ПАЛІТЫКА «ВАЕННАГА КАМУНІЗМУ»
ХАРЧРАЗВЁРСТКА НЭП ХАРЧПАДАТАК
ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ СССР
КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ФЕДЭРАЦЫЯ

**1. Грамадзянская вайна ў Расіі: удзельнікі і іх мэты, асноўныя этапы, наступствы.** Кастрычніцкая рэвалюцыя і выкліканыя ёю радыкальныя перамены сутыкнуліся з жорсткім супрацьстаяннем, якое прыняло форму *грамадзянскай вайны*. Асноўнымі сіламі ў гэтым процiборстве былі *«чырвоныя»* і *«белыя»*.

Удзельнікі Грамадзянскай вайны і іх мэты

ЧЫРВОНЫЯ

Барацьба за ліквідацыю буржуазных парадкаў, усталяванне ўлады рабочых і сялян у форме Саветаў, будаўніцтва сацыялізму і камунізму




БЕЛЫЯ




Звяржэнне ўлады бальшавікоў, аднаўленне рускай дзяржаўнасці, буржуазна-дэмакратычных свабод і ліберальнай эканомікі

**Бальшавікі і іх прыхільнікі** — пралетарыят, беднейшае сялянства і нязначная частка інтэлігенцыі

**Антыбальшавіцкія сілы** — буржуазія, афіцэрскі склад царскай арміі, заможнае сялянства, казацтва, а таксама рабочыя і сяляне, якія пацярпелі ад Савецкай улады

### Этапы Грамадзянскай вайны

У гэты канфлікт, трымаючыся ўласных інтарэсаў, умяшаліся 14 дзяржаў. Апроч таго, удзельнікамі Грамадзянскай вайны ў Расіі былі нацыяналістычныя партыі і рухі, разнастайныя ваенна-палітычныя сілы і проста бандыцкія фарміраванні.

| Перыяд вайны | Храналагічныя рамкі | Змест і асноўныя падзеі |
|---|---|---|
| 1 | Восень 1917 — лістапад 1917 г. | **Фарміраванне сіл супрацьстаяння і асноўных франтоў**<br>Усталяванне Савецкай улады восенню 1917 — вясной 1918 г. суправаджалася мноствам антыбальшавіцкіх выступленняў у розных гарадах Расіі. Яны не набылі сур'ёзнага маштабу, як і іншаземная інтэрвенцыя. Заключэнне Брэсцкага міру ў сакавіку 1918 г. з Германіяй сфарміравала сур'ёзную апазіцыю савецкаму ўраду, якая была ўзмоцнена ўвядзеннем харчовай дыктатуры (харчразвёрсткі). У маі-чэрвені 1918 г. палітычная барацьба паміж бальшавікамі і іх праціўнікамі пачала перарастаць у адкрытае ваеннае супрацьстаянне. Адбылося выступленне чэхаславацкага корпуса. Паўсталі сяляне, незадаволеныя харчразвёрсткай. У той жа час адбываецца масавая мабілізацыя рабочых у Чырвоную армію |
| 2 | Лістапад 1918 — сакавік 1920 г. | **Этап вырашальных бітваў**<br>Адбылася кансалідацыя антыбальшавіцкіх сіл.<br>Адмірал А. В. Калчак абвясціў сябе Вярхоўным правіцелем Расіі. На поўдні Расіі ў студзені 1919 г. белыя арміі былі аб'яднаны пад камандаваннем генерала А. І. Дзянікіна. Савецкая ўлада трапіла ў кольца белых армій і інтэрвентаў. Разам з тым адыход германскіх войскаў з тэрыторыі краіны дазволіў РСФСР вярнуць пад свой кантроль значную частку Прыбалтыкі, Беларусі і Украіны. У маі 1919 г. часці Чырвонай арміі, папоўненыя рабочымі, пачалі контрнаступ, у выніку якога арміі А. В. Калчака і А. І. Дзянікіна былі разгромленыя |
| 3 | Сакавік 1920 — кастрычнік 1922 г. | **Этап ваеннага паражэння белых армій**<br>Заключэнне перамір'я з Польшчай у кастрычніку 1920 г. дазволіла бальшавікам засяродзіць усе сілы на Паўднёвым фронце. Чырвоная армія да сярэдзіны лістапада 1920 г. канчаткова разбіла белых у Крыме. Ва Усходняй Сібіры і на Далёкім Усходзе баі цягнуліся да кастрычніка 1922 г. |

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Вядомы расійскі гісторык, даследчык Грамадзянскай вайны І. С. Рацькоўскі найважнейшым фактарам перамогі чырвоных назваў іх уменне бачыць «сацыяльны» бок вайны, які адрозніваў Грамадзянскую вайну ад іншых канфліктаў. Вучоны адзначае, што «яны (бальшавікі) як ніхто ўлічвалі сацыяльны складнік Грамадзянскай вайны. Гэта зрабілася часткай іх палітычнай праграмы, якая была данесена да большасці насельніцтва шляхам найлепшай у вайне прапаганды…».

1. *Ці згодныя вы з прадстаўленым пунктам погляду? Сваю думку аргументуйце.*
2. *Назавіце яшчэ прычыны, якія абумовілі перамогу бальшавікоў. Якія фактары вызначылі паражэнне белага руху?*




*Плакат часоў Грамадзянскай вайны*

Грамадзянская вайна каштавала Расіі велізарных ахвяр. Вайна прывяла да далейшага пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў краіне, да поўнай гаспадарчай разрухі. У выніку ваенных дзеянняў, ад холаду, хвароб і тэрору загінула, паводле розных падлікаў, ад 8 да 13 млн чалавек.

**Удзельнікі інтэрвенцыі**

**2. Замежная ваенная інтэрвенцыя: удзельнікі, мэты, вынікі.** Унутраны канфлікт у Расіі ў 1918–1922 гг. ускладняўся знешнім умяшаннем — замежнай інтэрвенцыяй. Найбольш актыўна дзейнічалі войскі Антанты і чэхаславацкі корпус, які выступіў супраць бальшавікоў у маі 1918 г. Значныя тэрыторыі былі акупаваныя Германіяй і Асманскай імперыяй. Усяго ў інтэрвенцыі на тэрыторыю Расіі прынялі ўдзел войскі 14 дзяржаў.

**Мэты ўдзельнікаў інтэрвенцыі**

Мэты гэтых дзяржаў былі рознымі, нярэдка нават супрацьлеглымі, і гэта перашкаджала аб'яднанню іх намаганняў: забеспячэнне працягу ўдзелу

Расіі ў Першай сусветнай вайне, звяржэнне Савецкай улады, супрацьстаянне камуністычным ідэям, канфіскацыя харчавання ў насельніцтва, усталяванне кантролю над усходняй тэрыторыяй Расіі. Так, ЗША процідзейнічалі спробам Японіі анексаваць расійскі Далёкі Усход. Інтэрвенты імкнуліся альбо захапіць частку расійскай тэрыторыі (Румынія, Японія, Турцыя), альбо атрымаць ад падтрымліваемых імі белагвардзейцаў значныя эканамічныя прывілеі (Англія, ЗША, Францыя і інш.).

### Этапы інтэрвенцыі

З пазіцыі Антанты перыяд інтэрвенцыі можна падзяліць на два асноўныя этапы. Першы з іх падоўжыўся да заканчэння Першай сусветнай вайны, і ўсе дзеянні краін гэтай кааліцыі былі падпарадкаваныя галоўнай мэце — перамозе ў вайне. Антанта была гатовая падтрымліваць на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ўсе сілы, здольныя аказваць супраціўленне Германіі, Аўстра-Венгрыі і Турцыі.

Пачынаючы з вясны 1918 г. у кіраўніцтве Антанты паступова сцвярджаецца перакананне ў тым, што ўрад бальшавікоў — саюзнік Германіі, а значыць — вораг. Да моманту заканчэння сусветнай вайны гэта ўяўленне спалучалася з іншым — з небяспекай увасобленага савецкім урадам «бальшавізму». Краіны Захаду баяліся, што пажар рэвалюцыі перакінецца і на іх тэрыторыі. Таму на другім этапе інтэрвенцыі (вясна 1918 — 1919 г.) галоўнай мэтай краін Антанты стала падтрымка ўсіх антыбальшавіцкіх сіл.

### Пачатак інтэрвенцыі

Пачатак інтэрвенцыі шэраг даследчыкаў звязваюць з выступленнем чэхаславацкага корпуса. Гэты корпус быў сфарміраваны ў Расіі ў гады Першай сусветнай вайны з ваеннапалонных аўстра-венгерскай арміі для ўдзелу ў вайне супраць Германіі. Многія з афіцэраў і салдат корпуса спадзяваліся такім чынам садзейнічаць незалежнасці Чэхіі і Славакіі. У пачатку 1918 г. корпус, які знаходзіўся на

расійскай тэрыторыі, рыхтаваўся да адпраўкі ў Заходнюю Еўропу праз Далёкі Усход. У маі 1918 г. Антантай было падрыхтавана антыбальшавіцкае паўстанне корпуса, эшалоны якога расцягнуліся па чыгунцы ад Пензы да Уладзівастока. Паўстанне паўсюль актывізавала антыбальшавіцкія сілы, падымаючы іх на ўзброеную барацьбу, стварала мясцовыя ўрады. Пры гэтым варта падкрэсліць, што на тэрыторыі Расійскай імперыі знаходзіліся сотні тысяч аўстра-германскіх ваеннапалонных, з якіх вельмі многія перайшлі на бок бальшавікоў, складаючы першапачаткова касцяк Чырвонай арміі.

**Інтэрвенцыя краін Антанты**

Рэальныя дзеянні краін Антанты пачаліся з высадкі брытанскіх войскаў у Мурманску ў сакавіку 1918 г. Летам 1918 г. войскі Антанты высадзіліся ва Уладзівастоку і Архангельску, восенню гэтага ж года іх караблі зайшлі ў Севастопаль. У снежні 1918 г. французскія атрады пры падтрымцы белых высадзіліся ў Адэсе. Інтэрвенты практычна не ўступалі ў баі з Чырвонай арміяй, абмяжоўваючыся падтрымкай белых фарміраванняў. Замежныя дзяржавы настойліва клапаціліся аб сваіх уласных мэтах — на шкоду інтарэсам Расіі.

**Інтэрвенцыя Японіі**

Найбольшую актыўнасць у арганізацыі інтэрвенцыі выяўляла Японія, якая яшчэ да ўстанаўлення Савецкай улады імкнулася аслабіць Расію як геапалітычнага саперніка. Акрамя садзейнічання атрадам белых, якія базіраваліся ў Сібіры і на Далёкім Усходзе, японцы, як і іх саюзнікі пасля заключэння Брэсцкага міру і першых паражэнняў белых войскаў, перайшлі да адкрытай ваеннай інтэрвенцыі. Жадаючы пазбегнуць вайны з Японіяй, Савецкая Расія пайшла на стварэнне ў красавіку 1920 г. Далёкаўсходняй рэспублікі. Аднак восенню 1922 г. японскія інтэрвенты вымушаны былі пакінуць Прымор’е.

**Вынікі інтэрвенцыі**

Умяшанне замежных дзяржаў прыкметна павялічыла працягласць ваеннага супрацьстаяння ў гады Грамадзянскай вайны, але вынік вызначаўся пазіцыяй сялянства. Велізарную ролю ігралі пастаўкі ўзбраення і боепрыпасаў для белых армій, прычым узбраення найбольш сучаснага, уключаючы артылерыю, танкі і самалёты. Дапамога, якая аказвалася краінамі Антанты беламу руху, была далёка не бескарыслівай. Саюзнікі не толькі разлічвалі замацаваць свой уплыў у Расіі пасля заканчэння Грамадзянскай вайны, але і па-драпежніцку выкарыстоўвалі яе рэсурсы, вывозячы сыравіну і прадукты харчавання.

**Адмова ад інтэрвенцыі**

У студзені 1919 г. на Парыжскай мірнай канферэнцыі саюзнікі вырашылі адмовіцца ад планаў інтэрвенцыі. Летам 1919 г. брытанскія, амерыканскія і французскія войскі ў колькасці 12 тысяч, якія знаходзіліся ў Архангельску і Мурманску, былі эвакуіраваны.

**Пераход да палітыкі «ваеннага камунізму»**

**3. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні Савецкай улады.** Першыя дэкрэты Савецкай улады былі вынікам барацьбы бальшавікоў за ўладу і дапамаглі перацягнуць на іх бок значную частку салдат, сялян, рабочых, нацыянальнай інтэлігенцыі. Імклівае «шэсце Савецкай улады» сфарміравала шмат у каго з бальшавікоў ілюзію магчымасці непасрэднага пераходу да камунізму. Апроч таго, рост ваеннага супрацьстаяння з «белымі» патрабаваў беспарапыннага забеспячэння Чырвонай арміі ўзбраеннем, боепрыпасамі і харчаваннем. У гэтых умовах Савецкая ўлада намагалася падпарадкаваць эканоміку патрэбам вайны, максімальна мабілізаваць усе людскія і матэрыяльныя рэсурсы. У выніку сфарміравалася сістэма надзвычайных захадаў, якую У. І. Ленін пазней назваў *«ваенным камунізмам»*.

Успомніце змест першых дэкрэтаў Савецкай улады.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ






Беда надвигается на наше Советское Отечество!

Царь-голод спешит на помощь польской шляхте и генеральским шайкам Врангеля.

Крестьянин! Допустишь-ли ты голод в окопы твоих защитников?..

Отдашь-ли ты во власть голода рабочих, кующих оружие?..

Оставишь-ли ты без куска хлеба детей и женщин?..

Тот, кто прячет хлеб, пособник царя и помещиков!

Тот, кто изводит зерно на самогонку, пьет кровь голодных братьев!

Никакой милости утайщикам хлеба!

Никакой пощады спекулянтам!

Выполнил-ли ты, брат крестьянин, разверстку?.

Спеши! Немедли!..







1. *Разгледзьце савецкія агітацыйныя плакаты, прысвечаныя палітыцы «ваеннага камунізму». Да чаго яны заклікалі? Да каго былі звернуты?*
2. *Як бальшавікі тлумачылі неабходнасць увядзення харчовай развёрсткі?*
3. *Хто, на думку бальшавікоў, быў галоўным праціўнікам такой палітыкі?*

### Мерапрыемствы і вынікі палітыкі «ваеннага камунізму»

Як сістэма сацыяльна-эканамічных мерапрыемстваў «ваенны камунізм» склаўся ў другой палове 1918 — пачатку 1919 г. Яго тэарэтычную аснову складалі ўяўленні аб магчымасці непасрэднага ўвядзення камунізму, ідэі абагульнення сродкаў вытворчасці і працы.




**Прыняцце Дэкларацыі правоў народаў Расіі**

**4. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва.** Працэс нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі былой Расійскай імперыі бярэ пачатак з *«Дэкларацыі правоў народаў Расіі»* (3 (16) лістапада 1917 г.).

**Рэалізацыя права народаў на самавызначэнне**

Савецкая Расія не перашкаджала рэалізацыі права асобных народаў на самавызначэнне. 31 снежня 1917 г. савецкі ўрад прызнаў незалежнасць Фінляндыі. У жніўні 1918 г. У. Ленін падпісаў дэкрэт аб адмове ад дамоваў аб падзеле Польшчы, заключаных ранейшай уладай.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Дэкларацыі правоў народаў Расіі**

...Савет Народных Камісараў вырашыў пакласці ў аснову сваёй дзейнасці па пытанні аб нацыянальнасцях Расіі наступныя пачаткі:

1) Роўнасць і суверэннасць народаў Расіі.

2) Права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне, аж да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы.

3) Адмена ўсіх і ўсякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў.

4) Свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнаграфічных груп, якія насяляюць тэрыторыю Расіі.

*1. Дакажыце, што прыняцце Дэкларацыі правоў народаў Расіі спрыяла нацыянальна-дзяржаўнаму самавызначэнню народаў былой Расійскай імперыі.*
*2. Якія дзяржавы ўзніклі на тэрыторыі Расійскай імперыі ў 1917–1922 гг.?*

Канстытуцыя РСФСР 1918 г. замацавала агульныя прынцыпы федэратыўнага ўпарадкавання, але не вызначыла формы і статус аўтаномных утварэнняў, размежаванне іх паўнамоцтваў з цэнтрам. У 1918–1922 гг. многія народы Савецкай дзяржавы атрымалі аўтаномію двух узроўняў: рэспубліканскую і абласную. Былі ўтвораны савецкія рэспублікі: у снежні 1917 г. — Украінская ССР, у студзені 1919 г. — Беларуская, у красавіку 1920 г. — Азербайджанская, у лістападзе 1920 г. — Армянская, у лютым 1921 г. — Грузінская ССР.

**5. Утварэнне СССР. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы.** У 1922 г. завяршаецца Грамадзянская вайна на Далёкім Усходзе. Савецкія рэспублікі заняліся мірным будаўніцтвам. Актуалізуецца праблематыка эканамічнага аднаўлення і дзяржаўнага будаўніцтва, палітычнага саюза савецкіх рэспублік. Сярод перадумоў такога саюза варта адзначыць:

Перадумовы ўтварэння СССР

1. Агульныя эканамічныя і культурныя сувязі, якія фарміраваліся на працягу стагоддзяў.

2. Адзіная камуністычная партыя (нацыянальныя партыі савецкіх рэспублік уваходзілі ў склад Расійскай кампартыі).

3. Шматэтнічны склад насельніцтва рэспублік, змешанасць насельніцтва.

4. Імкненне да забеспячэння бяспекі ва ўмовах спаду сусветнага рэвалюцыйнага руху.

Варыянты ўтварэння СССР

У верасні 1922 г. народны камісар па справах нацыянальнасцей І. В. Сталін прапанаваў план «аўтанамізацыі», які прадугледжваў уключэнне ўсіх савецкіх рэспублік, што існавалі тады, у склад РСФСР на правах аўтаноміі. Аднак не ўсе з іх падтрымалі гэтую ідэю. Таму У. І. Ленін, які валодаў беспярэчным аўтарытэтам, прапанаваў утварыць добраахвотны саюз суверэнных і раўнапраўных рэспублік, з наданнем кожнай з іх права свабоднага выхаду з Саюза.

Прыняцце Канстытуцыі СССР

**30 снежня 1922 г.** у Маскве адбыўся І Усесаюзны з'езд Саветаў, на якім прадстаўнікамі чатырох рэспублік — УССР, БССР, РСФСР, Закаўказскай СФСР — былі падпісаныя Дэкларацыя аб стварэнні СССР і Саюзны дагавор. Ад БССР гэтыя дакументы падпісаў А. Р. Чарвякоў. **31 студзеня 1924 г.** ІІ Усесаюзны з'езд Саветаў зацвердзіў Канстытуцыю СССР. Такім чынам, БССР выступіла краінай-заснавальніцай СССР.

Першая Канстытуцыя СССР уключала Дэкларацыю і Саюзную дамову. Дэкларацыя ўтрымлівала прычыны і прынцыпы аб'яднання. У дамове вызначаліся асновы аб'яднання: кампетэнцыя СССР, структура органаў улады і кіравання, адзінае грамадзянства і інш. У кампетэнцыю саюзных органаў перадаваліся пытанні знешняй палітыкі, знешняга гандлю, фінансаў, абароны, шляхоў зносін. Усе іншыя пытанні заставаліся ў веданні саюзных рэспублік.






Разгледзьце дзяржаўныя сімвалы СССР. Як вы лічыце, што сімвалізуюць чырвоны колер сцяга, зорка, серп і молат на гербе і сцягу?

## Органы ўлады СССР

Згодна з Канстытуцыяй СССР вышэйшым органам краіны абвяшчаўся *Усесаюзны з'езд Саветаў*, а ў перапынках паміж яго скліканнямі — *Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК) СССР*, які складаўся з дзвюх палат: *Савета Саюза* і *Савета Нацыянальнасцей*.

Другая Канстытуцыя СССР (1936 г.) замацавала палажэнне аб аднолькавай сіле агульнасаюзных законаў на тэрыторыі ўсіх саюзных рэспублік. Для грамадзян СССР усталёўвалася адзінае саюзнае грамадзянства. Уводзілася ўсеагульнае прамое роўнае выбарчае права. Вышэйшым кіроўным органам краіны зрабіўся Вярхоўны Савет СССР.

## Савецкая палітычная сістэма

Савецкая палітычная сістэма склалася ў другой палове 1920-х — 1930-я гг. Вялікі ўплыў на яе фарміраванне аказалі такія фактары, як шматвяковая традыцыя моцнай цэнтралізаванай улады, варожае стаўленне да Савецкай дзяржавы большасці развітых капіталістычных дзяржаў, задачы эканамічнай і культурнай мадэрнізацыі, якія краіна мусіла вырашаць у жорсткіх знешнепалітычных умовах.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Утварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік




| | |
|---|---|
| ⦿ МАСКВА | Сталіцы дзяржаў |
| ◎ МІНСК | Сталіцы рэспублік СССР |
| ○ Самара | Іншыя гарады |

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў да 1941 г.
- саюзных рэспублік СССР
- на захадзе СССР у 1922–1939 гг.
- народных савецкіх рэспублік, якія знаходзіліся ў дагаворных адносінах з РСФСР да нацыянальна-дзяржаўнага размежавання ў Сярэдняй Азіі

**А** – Харэзмская Народная Савецкая Рэспубліка
**Б** – Бухарская Народная Савецкая Рэспубліка

Лічбамі на карце пазначаны:
1– Карэла-Фінская ССР (1940–1956); 2 – Эстонская ССР (з 1940 г.); 3 – Латвійская ССР (з 1940 г.); 4 – Літоўская ССР (з 1940 г.); 5 – Беларуская ССР; 6 – Украінская ССР; 7 – Малдаўская ССР (з 1940 г.); 8 – Грузінская ССР; 9 – Армянская ССР; 10 – Азербайджанская ССР; 11 – Таджыкская ССР (з 1929 г.); 12 – Кіргізская ССР (з 1936 г.)

*1. Якія дзяржавы падпісалі Дэкларацыю аб стварэнні СССР і Саюзную дамову?*
*2. Складзіце схему «Фарміраванне тэрыторыі СССР у міжваенны перыяд».*
*3. Якія геапалітычныя падзеі аказалі ўплыў на працэс фарміравання тэрыторыі СССР?*

У перыяд станаўлення Савецкай улады ў Расіі ўсталявалася ўлада адной партыі — Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) (РКП(б)) (ад 1925 г. — Усесаюзная Камуністычная партыя (бальшавікоў) (УКП(б))). У 1920–1930-я гг. у СССР адбывалася паступовае зліццё дзяржаўнага і пар-

**Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы**

- Наяўнасць аднапартыйнай сістэмы
- Зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату
- Унутрыпартыйная барацьба ў пытаннях будаўніцтва сацыялізму

тыйнага апарату. Рашэнні партыі разумеліся як дзяржаўныя рашэнні, мелі значэнне нарматыўных актаў і з'яўляліся абавязковымі для выканання. Дзяржаўныя органы ўлады — Саветы — трацілі сваё значэнне. Ад 1930-х гг. рэальная вярхоўная ўлада перайшла да вышэйшых партыйных органаў — Палітбюро, Сакратарыята ЦК. Менавіта яны выраршалі ўсе пытанні і вызначалі дзяржаўную палітыку ў краіне.

Сярэдзіна 1920-х гг. характарызуецца абвастрэннем унутрыпалітычнай барацьбы ў партыі. Яна была выкліканая не толькі супрацьстаяннем паміж прыхільнікамі Л. Троцкага і І. Сталіна, але і розным разуменнем умоў будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. Л. Троцкі выступаў за ідэю сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Ён лічыў, што без падтрымкі міжнароднага пралетарыяту Савецкая Расія не мае шанцаў, таму актыўна абараняў падтрымку камуністычных рухаў за мяжой, у тым ліку праз Камінтэрн. І. Сталін выказаў ідэю пабудовы «сацыялізму ў асобна ўзятай краіне». Ён сцвярджаў, што неабходна засяродзіцца на ўнутраным будаўніцтве сацыялізму, незалежна ад знешніх фактараў. Перамога ў гэтай барацьбе сталінскага кіраўніцтва выступіла перадумовай новага этапу мадэрнізацыі канца 1920-х — 1930-х гг.

**Пачатак новай эканамічнай палітыкі**

**6. Савецкая мадэрнізацыя.** Найвастрэйшы сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс пачатку 1920-х гг. прымусіў бальшавіцкае кіраўніцтва адмовіцца ад палітыкі «ваеннага камунізму».

Успомніце, у чым праяўляўся эканамічны і палітычны крызіс напачатку 1920-х гг.

У сакавіку 1921 г. на X з'ездзе РКП(б) быў абвешчаны пераход да *новай эканамічнай палітыкі* (НЭП). Мэтамі НЭПу былі зніжэнне сацыяльнай напружанасці, умацаванне сацыяльнай базы Савецкай улады, выхад з крызісу і аднаўленне эканомікі.

Першапачаткова НЭП абмежаваўся заменай харчразвёрсткі на харчпадатак і спробай прадуктаабмену.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ




**Са звароту УЦВК і СНК «Да сялянства РСФСР»**
**23 сакавіка 1921 года**

Пастановай УЦВК і СНК развёрстка адмяняецца і замест яе ўводзіцца падатак на прадукты сельскай гаспадаркі. Гэты падатак павінен быць меншы, чым хлебная развёрстка. Ён павінен прызначацца яшчэ да вясенняй сяўбы, каб кожны селянін мог загадзя ўлічыць, якую долю ўраджаю ён мае аддаць дзяржаве і колькі застанецца ў яго поўным распараджэнні. Падатак належыць спаганяць без кругавой парукі, іншымі словамі, ён павінен прыпадаць на асобнага гаспадара, каб руплівому і працавітаму гаспадару не даводзілася плаціць за неахайнага аднавяскоўца. Пасля выканання падатку лішкі, якія застаюцца ў селяніна, паступаюць у ягонае поўнае распараджэнне. Ён мае права абмяняць іх на прадукты і прылады, якія будзе дастаўляць на вёску дзяржава з-за мяжы і са сваіх фабрык і заводаў; ён можа выкарыстоўваць іх для абмену на патрэбныя яму прадукты праз кааператывы і на мясцовых рынках і кірмашах…

1. *Вызначце перавагі харчпадатку ў параўнанні з харчразвёрсткай.*
2. *Якія магчымасці для развіцця сялянскай гаспадаркі дало ўвядзенне харчпадатку?*

### Мерапрыемствы новай эканамічнай палітыкі

Нарастанне сялянскай вайны выступіла вызначальным фактарам паступовага змянення кірунку ў бок рыначных адносін. На аснове рашэнняў IX Усерасійскага з'езда Саветаў (снежань 1921 г.) дазваляліся рыначныя адносіны, невялікія прыватныя прад-



Савецкі чырвонец 1923 г.

прыемствы, найманне рабочай сілы, свабода гандлю, прыцягненне замежнага капіталу, адмяняліся картачная сістэма і ўраўняльнае размеркаванне, працоўныя арміі і працоўная павіннасць. Пры гэтым дзяржава захоўвала свае пазіцыі ў банкаўскай сферы, на буйны́х і часткова сярэдніх прадпрыемствах. Гэта запатрабавала развіцця кааперацыі, удасканалення падатковай сістэмы і правядзення грашовай рэформы, якая стварыла канверсоўную валюту (чырвонец).

На 1926 г. па асобных паказчыках быў дасягнуты ўзровень эканамічнага развіцця 1913 г., а асноўны аб'ём даваенных паказчыкаў — у 1929 г. Аднак да гэтага часу вядучыя краіны свету ў сваім развіцці сягнулі далёка наперад. Неабходна было стварыць магутную эканоміку, якая дазволіла б адбіць агрэсію любога праціўніка.

### Індустрыялізацыя

*Індустрыялізацыя* была заклікана забяспечыць хуткае развіццё цяжкай прамысловасці, абапіраючыся на якую, меркавалася павялічыць вытворчасць ваеннай тэхнікі ва ўмовах супрацьстаяння СССР усяму капіталістычнаму свету. Першапачатковая стратэгія, прынятая ў снежні 1925 г. на XIV з'ездзе ВКП(б), прадугледжвала збалансаванае развіццё ўсіх галін прамысловасці. Напрыканцы 1920-х гг. яна была скарэктавана і пастаўлена задача першачарговага развіцця цяжкай прамысловасці. Апошняя мела задачай забяспечыць у далейшым спрыяльныя ўмовы для развіцця лёгкай прамысловасці.

Чаму, нягледзячы на ўсе цяжкасці, савецкая індустрыялізацыя спарадзіла ў грамадстве велізарны энтузіязм і творчую энергію і выклікала захапленне ва ўсім свеце?




*Савецкія плакаты, прысвечаныя індустрыялізацыі*

На фоне сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. у заходніх краінах савецкія людзі імкнуліся радыкальнымі метадамі ў сціслыя тэрміны ліквідаваць адставанне Савецкай дзяржавы ад развітых краін, даказаць перавагі сацыялістычнага ладу над капіталістычным. Прапаноўваліся і прымаліся «сустрэчныя планы», хоць пад іх часам не было ніякага матэрыяльнага забеспячэння.

**Калектывізацыя**

*Калектывізацыя*, ухваленая XV з'ездам ВКП(б) у **1927 г.**, першапачаткова меркавала паступовае развіццё разнастайных формаў кааперацыі, у тым ліку калектыўных гаспадарак (таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, арцелі і камуны). Планавалася істотна ўзмацніць механізацыю сельскагаспадарчых работ, для чаго ствараліся машынна-трактарныя станцыі (МТС). Па меры ўзнікнення цяжкасцей з адабраннем збожжа ў сялян у 1930 г. фарміруецца ўстаноўка на суцэльную калектывізацыю. Кулакі — арганізатары буйны́х прыватных гаспадарак на вёсцы — падлягалі раскулачванню і пазбаўленню ўсёй уласнасці. Аднак праз самаўпраўства мясцовых улад былі раскулачаныя многія серадзнякі. Дзясяткі тысяч раскулачаных былі выселеныя ў Казахстан і Сібір, частка з іх загінула падчас гэтага перасялення. У выніку суцэльнай калектывізацыі была створана сістэма перапампоўвання фінансавых, матэрыяльных, працоўных рэсурсаў з аграрнага сектара эканомікі ў індустрыяльны.

Ад пачатку ажыццяўлення сацыялістычных пераўтварэнняў кіраўніцтва бальшавікоў разумела, што новы лад перамагае толькі тады, калі яго шырока падтрымлівае народ. Савецкая ўлада вялікую ўвагу надавала навучанню і выхаванню маладога пакалення. Усё рабілася дзеля таго, каб моладзь прасякнулася ідэямі стварэння лепшага свету.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ




Кастрычніцкая рэвалюцыя паспрыяла павелічэнню грамадска-палітычнай актыўнасці моладзі, што прывяло да стварэння 29 кастрычніка 1918 г. Расійскага камуністычнага саюза моладзі, пазней перайменаванага ва Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі (УЛКСМ). Камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве сацыялістычнага грамадства (індустрыялізацыі, калектывізацыі, культурнай рэвалюцыі).

19 мая 1922 г. на ІІ Усерасійскай канферэнцыі камсамола было прынятае рашэнне стварыць адзін з найбольш масавых рухаў падлеткаў — піянерскія атрады. У першыя гады піянерскі рух насіў імя Спартака, а ў 1926 г. назву змянілі на Усесаюзную піянерскую арганізацыю імя У. І. Леніна.

Сярод галоўных сімвалаў піянераў — піянерскі сцяг, піянерскі гальштук, значок. Асноўнымі атрыбутамі былі форма, якая ўключала абазначэнне звання, барабан і горн. Гукі горна і барабана мелі пэўны сэнс, яны заклікалі да супольнай дзейнасці на карысць грамадства і краіны.

1. *Як вы лічыце, з якой мэтай ствараліся маладзёжныя арганізацыі? Прывядзіце прыклады мастацкіх фільмаў, літаратурных твораў, у якіх галоўнымі героямі з'яўляюцца камсамольцы і піянеры. Якімі якасцямі валодаюць галоўныя героі гэтых твораў? Як у творах мастацтва паказаная роля піянераў і камсамольцаў у грамадстве?*
2. *Якая беларуская маладзёжная арганізацыя з'яўляецца пераемніцай УЛКСМ?*
3. *Параўнайце сімволіку, кірункі дзейнасці Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, УЛКСМ і сучасных беларускіх маладзёжных арганізацый. Што змянілася, а што засталося як раней?*

У рэчышчы культурнай рэвалюцыі, якую праводзіла Савецкая ўлада, была створана сістэма дзяржаўных бясплатных школ, пазашкольных і дашкольных устаноў, бібліятэк, музеяў.

Урэгуляванне адносін з суседнімі дзяржавамі

**7. Знешняя палітыка СССР.** Знешняя палітыка Савецкай Расіі пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. адлюстроўвала не толькі арыентацыю бальшавікоў на еўрапейскую рэвалюцыю, але і рэальную палітыку. Перш за ўсё неабходна было ўрэгуляваць адносіны з бліжэйшымі суседзямі. У канцы 1920 — пачатку 1921 г. урад РСФСР падпісаў мірныя дагаворы з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, Польшчай. Нармалізаваліся адносіны Савецкай Расіі з дзяржавамі на паўднёвых межах (Афганістанам, Турцыяй, Іранам, Манголіяй).

Пераадоленне дыпламатычнай ізаляцыі

Найважнейшай задачай з'яўляўся прарыў дыпламатычнай ізаляцыі. Заходнія дзяржавы патрабавалі ад Савецкай Расіі выплаты дарэвалюцыйных даўгоў і кампенсацыі страт ад нацыяналізацыі замежнай уласнасці. Прарывам у міжнародных адносінах стала Рапальская дамова з Германіяй 1922 г. аб адмове ад узаемных прэтэнзій і ўсталяванні дыпламатычных адносін. Неўзабаве з'явілася дыпламатычнае прызнанне і з боку іншых буйны́х еўрапейскіх дзяржаў. У 1924 г. СССР усталяваў дыпламатычныя адносіны з Вялікабрытаніяй і Францыяй.

Знешняя палітыка ў 1930-я гг.

У 1930-я гг. у якасці галоўнай знешнепалітычнай задачы кіраўніцтва СССР разглядала стварэнне ў Еўропе сістэмы калектыўнай бяспекі. У 1933 г. былі ўсталяваныя дыпламатычныя адносіны з ЗША. У 1934 г. СССР стаў членам Лігі Нацый. Прапанову аб уступленні ў Лігу Нацый Савецкі Саюз атрымаў ад Францыі, якая таксама разглядала нацысцкую Германію ў якасці патэнцыяльнага агрэсара. У маі 1935 г. СССР заключыў дагаворы ўзаемадапамогі з Францыяй і Чэхаславакіяй. На VII кангрэсе Камінтэрна ў 1935 г. у Маскве было прынята рашэнне аб супрацоўніцтве камуністаў з усімі дэмакратычнымі сіламі, аб стварэнні адзінага працоўнага фронту і на яго аснове — антыфашысцкага фронту.

**8. Вынікі палітычнай і эканамічнай трансфармацыі савецкага грамадства.** Дзякуючы прадуманай палітыцы кіраўніцтва СССР удалося заняць адну з галоўных пазіцый у свеце. Коштам гераічных намаганняў савецкі народ у надзвычай сціслыя гістарычныя тэрміны здзейсніў пераход ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства.

Вынікі індустрыялізацыі

Значны прамысловы патэнцыял быў створаны на ўсходзе краіны, у нацыянальных рэспубліках. Паводле аб'ёму вырабу прамысловай прадукцыі СССР выйшаў на другое месца ў свеце пасля ЗША. Узнік шэраг новых галін: авіяцыйная, аўтамабільная, алюмініевая, падшыпнікавая, авіябудаўніцтва і інш. Рэзка знізіўся імпарт. Хутка ішло развіццё гарадоў. У іх з'явіліся новыя віды грамадскага транспарту — метро і тралейбус.

Змены ў грамадскім жыцці

Для мільёнаў маладых людзей будаўніцтва новага грамадства адкрыла перспектыву, сэнс жыцця. Светаадчуванне пераважнай большасці савецкіх людзей таго часу было пазітыўнае, яны ганарыліся сваёй дзяржавай. Масавыя грамадскія аб'яднанні, створаныя рашэннямі Камуністычнай партыі, ахоплівалі мільёны грамадзян СССР.

У нацыянальнай палітыцы кіраўніцтва СССР у 1930-я гг. перайшло да рэалізацыі плана паскоранага збліжэння і зліцця ўсіх народаў СССР у адзіную савецкую нацыю.

У сваім дакладзе на XVII З'ездзе ВКП(б) у студзені 1934 г. І. В. Сталін прывёў наступныя лічбы са словамі: «Гэта значыць, што краіна наша стала трывала і канчаткова — індустрыяльнай краінай».

| Суадносіны, % | 1913 г. | 1929 г. | 1930 г. | 1931 г. | 1932 г. | 1933 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Прамысловасць | 42,1 | 54,5 | 61,6 | 66,7 | 70,7 | 70,4 |
| Сельская гаспадарка | 57,9 | 45,5 | 38,4 | 33,3 | 29,3 | 29,6 |

1. Пра які працэс, што адбываўся ў СССР, сведчаць гэтыя лічбы?
2. Якое значэнне пераўтварэнне краіны ў індустрыяльную мела для наступнай гісторыі СССР?

*Пасля перамогі ў Грамадзянскай вайне савецкі ўрад хуткімі тэмпамі ажыццяўляў мадэрнізацыю грамадства і дзяржавы. Вынікам гэтага было з’яўленне на палітычнай карце свету новай дзяржавы — СССР, у якой у выніку індустрыялізацыі быў створаны магутны ваенна-прамысловы комплекс. Змяніўся сацыяльны склад насельніцтва, удвая вырасла колькасць рабочых. Сацыялізм савецкага ўзору зрабіўся альтэрнатыўнай капіталізму мадэллю індустрыяльнага развіцця грамадства.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 1918 г. — утварэнне Польшчы і Чэхаславакіі | 1919 г. — утварэнне ССРБ |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Чаму пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі пачалася Грамадзянская вайна? Назавіце яе ўдзельнікаў і іх мэты. Ахарактарызуйце этапы Грамадзянскай вайны. Якія яе асноўныя наступствы? Як вы лічыце, чаму бальшавікі перамаглі?
2. Чаму падчас Грамадзянскай вайны была зроблена спроба ваеннай інтэрвенцыі ў Расію? Вызначце ўдзельнікаў ваеннай інтэрвенцыі і іх мэты. Як ваенная інтэрвенцыя паўплывала на ход Грамадзянскай вайны?
3. Вызначце прычыны ўвядзення палітыкі «ваеннага камунізму». Чаму яе замянілі на новую эканамічную палітыку?
4. Вызначце асноўныя прынцыпы нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі бальшавікоў. Вылучыце асноўныя дасягненні дадзенай палітыкі.
5. Назавіце асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Чым яны былі абумоўлены?
6. Ахарактарызуйце асноўныя вектары знешняй палітыкі Савецкай Расіі (СССР) у 1920–1930-я гг. Ці можна сцвярджаць, што СССР у гэты перыяд пераадолеў дыпламатычную ізаляцыю?
7. Прааналізуйце мэты, этапы і вынікі палітычнай і эканамічнай трансфармацыі СССР у 1920–1930-я гг.